Курыльчык, Л. Патэнцыял? У кожнага! / Л. Курыльчык // Настаўніцкая газета. – 2024. – 16 лют. – С. 21.

**Патэнцыял? У кожнага!**



***У сярэдняй школе № 46 імя І. Х. Баграмяна Віцебска 100% навучэнцаў наведваюць факультатыўныя заняткі, якія адпавядаюць сферы іх інтарэсаў.***

Факт інтрыгуючы, асабліва калі прыняць да ўвагі, што ва ўстанове вучыцца 2060 школьнікаў, а вывучэнне прадметаў на павышаным узроўні ў рамках факультатываў – справа добраахвотная. Няўжо ўсе вучні гэтай установы высокаматываваныя?

У дырэктара школы Ірыны Астапенка на гэтае пытанне ёсць адказ. Сам жа факт стапрацэнтнага наведвання навучэнцамі факультатыўных заняткаў яна лічыць толькі вынікам дзейнасці садружнасці педагогаў, навучэнцаў і бацькоў на аснове ўстаноўкі «ўсе дзеці па-свойму таленавітыя». Што і абумоўлівае, па яе меркаванні, паспяховасць работы калектыву па развіцці кожнага дзіцяці.

**Перадумова поспеху**

– Мы распаўсюджваем паняцце «адораныя» на ўсіх вучняў, а не толькі на тых, хто праяўляе асаблівыя інтэлектуальныя альбо творчыя здольнасці, – расказала Ірына Юр’еўна. – Наша сістэма работы арыентавана на тых, хто мае патэнцыял для развіцця сваіх пэўных якасцей. А яны абавязкова ёсць у кожнага, нават калі дзіця і яго бацькі пра гэта не ведаюць. Дапамагчы выявіць гэтыя якасці і развіць – задача школы. Яна шырэйшая, чым выяўленне асаблівых здольнасцей у асаблівых навучэнцаў, больш гуманная і пераважная, паколькі тычыцца кожнага вучня. І больш складаная як па аб’ёме работы, так і ў плане разглядання паняцця адоранасці. Ва ўстанове створана такая адукацыйная прастора, у якой развіваецца патэнцыял кожнага дзіцяці, уключаючы і навучэнцаў з асаблівымі патрэбамі, для якіх адкрыты пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.



**Вызначальны падыход**

Мэты і змест работы ўстановы, па словах Ірыны Юр’еўны, вызначае падыход, арыентаваны на развіццё ўсіх дзяцей, а не толькі высокаматываваных на навучанне:

– Як вядома, матывацыя абапіраецца на веды. Гэта падразумявае, што, ўсведамляючы свой патэнцыял і разумеючы, што ён можа быць развіты, але толькі на аснове ведаў, вучань не ўпусціць шанс і прыйдзе на патрэбны яму факультатыў. Для ўсведамлення ж свайго патэнцыялу дзіцяці трэба даведацца пра сябе больш. І ў гэтым дапамагае дыягностыка яго здольнасцей.

Дарэчы, як тут не ўзгадаць погляд Т. Ф. Пашковіч, беларускага аўтара метадычнай распрацоўкі «Сістэма работы з адоранымі дзецьмі»: калі гаворка ідзе пра дзейнасць ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі, то мэтазгодна наладжваць сістэму работы з дзецьмі, якія валодаюць патэнцыялам. А патэнцыял – гэта не толькі і не абавязкова адоранасць інтэлектуальнага або творчага плана, але і здольнасці да розных відаў дзейнасці. Такой устаноўкі прытрымліваюцца і педагогі школы.

*У сярэдняй школе № 46 імя І. Х. Баграмяна Віцебска працуюць 156 педагогаў: 98% з іх маюць вышэйшую адукацыю, 69% – першую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*

***Як «вымяраюць» таленты***

Дыягнастычная работа па вывучэнні інтарэсаў і схільнасцей дзяцей праводзіцца скаардынавана ва ўзаемадзеянні педагогаў з псіхолагамі і бацькамі першакласнікаў. Праз анкетаванне вызначаюцца ўяўленні бацькоў аб схільнасці дзяцей да розных відаў дзейнасці, вынікі анкетавання

бацькоў параўноўваюцца з данымі псіхолага-педагагічнай дыягностыкі ўзроўню развіцця здольнасцей дзяцей. Трэба адзначыць, што даныя дыягностыкі навучэнцаў і анкетавання бацькоў не ўспрымаюцца ва ўстанове ў якасці канчатковага выніку. Як адзначае педагог-псіхолаг Вольга Стрык, ні адзін з падыходаў нельга абсалютызаваць, бо патэнцыял дзіцяці часта не паддаецца вымярэнням, гэта заўсёды справа штучная. Т. Ф. Пашковіч таксама сцвярджае, што «правільна вызначыць межы здольнасцей і адоранасці няпроста, часта і немагчыма». Тым больш што на практыцы даволі часта жаданні дзяцей, запыты бацькоў і даныя дыягностыкі разыходзяцца. Ёсць дзеці, якія ўсведамляюць свае запыты і магчымасці, хочуць і могуць развіваць свае здольнасці. Ёсць тыя, хто ўсведамляе і можа, але не хоча. І тыя, хто хоча, але ў свае сілы не верыць. А ёсць і тыя, хто аб сваіх здольнасцях нават і не падазрае. Як тут быць? Як лічыць Ірына Юрьеўна, канчатковы адказ можа даць толькі дзейнасць, падчас якой і дзеці, і бацькі, і педагогі сябе правераць. А для для гэтага патрэбны ўмовы для дзейнасці згодна з запытамі вучняў і выбар дзейнасці.



**Выбар ёсць**

У школе дзейнічаюць 44 аб’яднанні па інтарэсах самых розных напрамкаў: харэаграфія, мастацкая творчасць, рукадзелле, вакал, тэатральнае мастацтва, літаратурнае краязнаўства. Пад кіраўніцтвам настаўнікаў фізічнай культуры і здароўя працуе 20 спартыўных секцый: баскетбол, футбол, ушу, тэквандо, лёгкая атлетыка, валейбол, атлетычная гімнастыка, гандбол, жаночы футбол, шашкі, шахматы.

Арганізаваны 352 факультатыўныя заняткі па прадметным, музычным, харэаграфічным, спартыўным, патрыятычным, мастацка-эстэтычным напрамках, таксама прапануюцца заняткі па энергазберажэнні і экалогіі.

*Ва ўстанове на працягу 8 гадоў дзейнічае навуковае таварыства вучняў 2–4 класаў «Юныя знаўцы» пад кіраўніцтвам настаўніцы пачатковых класаў І. І. Бузыканавай.*

Гэта аб’яднанне навучэнцаў, здольных да пошуку, якія імкнуцца да паглыблення ведаў як па асобных прадметах, так і ў навуковых галінах. Дарэчы, у групах прадоўжанага дня арганізавана работа ў рамках структурна-функцыянальнай мадэлі ўпраўлення фарміраваннем даследчых уменняў малодшых школьнікаў, распрацаваная выхавальніцай ГПД Кацярынай Аркадзьеўнай Ачапоўскай, магістрам педагагічных навук. Навукова-даследчая і праектная дзейнасць навучэнцаў з’яўляецца як неад’емнай часткай вучэбнага працэсу, так і важным кампанентам у пазакласнай рабоце. Зыходзячы з прынцыпу сістэмнасці, у 2021 годзе для навучэнцаў 1–4 класаў арганізавалі клуб цікаўных (любознательных), актыўных дзяцей – «КЛАД». Так малодшыя школьнікі далучаюцца да розных кірункаў інтэлектуальнай, творчай і спартыўнай дзейнасці.

**Перамогі як паказчык**

Паказчык высокага ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў – шматлікія перамогі ў прадметных алімпіядах, творчых конкурсах, навукова-практычных канферэнцыях, спартыўных спаборніцтвах. Напрыклад, 2 навучэнцы 4-х класаў пад кіраўніцтвам настаўніцы фізічнай культуры і здароўя Т. М. Бурохінай сталі ўдзельнікамі трэцяга этапу рэспубліканскага спартыўна-масавага мерапрыемства «300 талентаў для Каралевы». Пад кіраўніцтвам настаўніцы музыкі В. П. Барадзіной юныя вакалісты вынікова ўдзельнічаюць у мерапрыемствах абласнога, рэспубліканскага, міжнароднага ўзроўняў. Дзіцячы калектыў «Непаседы» пад кіраўніцтвам С. М. Пуцянковай больш за 10 гадоў радуе сваімі дасягненнямі. Толькі ў 2023 годзе юныя таленты атрымалі 6 дыпломаў І, ІІ, ІІІ ступені абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў.

У 2022/2023 навучальным годзе па выніках двух тураў Віцебскай абласной дыстанцыйнай алімпіяды «Перакрыжаванне» 80 навучэнцаў 1–2 класаў сталі ўладальнікамі дыпломаў І, ІІ і ІІІ ступені. Дарэчы, з ліку 150 зацікаўленых удзельнікаў самымі актыўнымі аказаліся першакласнікі. Навучэнцы 4-х класаў штогод займаюць прызавыя месцы ў алімпіядах па вучэбных прадметах «ЮНІОР». У мінулым годзе 6 навучэнцаў 4 класа за высокія вынікі ў алімпіядным руху занесены ў кнігу «Першамайскія надзеі». Нестандартны падыход да вызначэння адоранасці і яе развіцця ў пачатковых класах забяспечвае вынікі на ўсіх ступенях адукацыі.

Работы навукова-даследчага характару вучняў 3–10 класаў былі адзначаны 12 дыпломамі ад раённага да рэспубліканскага ўзроўню. А 20 навучэнцаў сталі прызёрамі трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. Дарэчы, за пяць апошніх гадоў вучні школы атрымалі 6 дыпломаў чацвёртага этапу рэспубліканскай алімпіяды.

**Людміла КУРЫЛЬЧЫК.**